*І. В. ІВАНОВА*

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ

Аналіз сучаснага стану інфармацыйнага забеспячэння вучоных і работнікаў вытворчасці аграпрамысловага комплексу рэспублікі дазваляе зрабіць вывады аб наступленні інфармацыйнага крызісу. Сістэма, што канцэнтравала ў цэнтральных органах інфармацыі былога Саюза яе збор і размеркаванне, спыняе сваё існаванне. Развальваецца цэнтралізаванае гарантаванае кнігазабеспячэнне бібліятэк. У гэтых умовах наша бібліятэка, якая абслугоўвае вучоных і практыкаў АПК, вырашае задачы, якія дазволілі б аператыўна і з дастатковай паўнатой даваць спажыўцам інфармацыю аб сусветным і створаным на тэрыторыі былога Саюза патоку інфармацыі.

Адной з крыніц атрымання інфармацыі аб новых дасягненнях сусветнай навукі і практыкі з'яўляюцца замежныя перыядычныя выданні. Агульная колькасць такіх часопісаў па пытаннях сельскай гаспадаркі складае звыш 20 тыс. назваў. Набыццё іх заўсёды ставіла перад бібліятэкай цяжкавырашальныя задачы з-за выдзялення недастатковых валютных асігнаванняў. У 1991 г. бібліятэцы наогул не далі валюты, у выніку чаго фонд замежных перыядычных выданняў не папаўняўся, а чытачы не атрымлівалі новай інфармацыі. На 1992 г. валюты хапіла толькі на 13 назваў часопісаў з ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі. Хутка будзе праводзіцца падпіска на 1993 г. Прэзідыуму ААН Беларусі неабходна вырашыць пытанне аб выдзяленні бібліятэцы неабходных асігнаванняў.

Актуальнай праблемай у камплектаванні фонду бібліятэкі з'яўляецца атрыманне ўсіх выданняў па пытаннях АПК, што выдаюцца арганізацыямі і ўстановамі, якія ўваходзяць у састаў ААН і Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Для стварэння бранІраванага фонду гэтых выданняў трэба абавязаць установы сістэмы ААН і Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання накіроўваць у адрас бібліятэкі ўсе выданні, што выдаюцца выдавецтвамі рэспублікі.

У сваю чаргу бібліятэка з мэтай захавання і адлюстравання дзейнасці вядучых вучоных Беларусі ў галіне сельскай гаспадаркі прыступіла да стварэння базы даных прац акадэмікаў ААН Беларусі. Тэхнічныя і праграмныя сродкі для рэалізацыі дадзенай задачы у нашай бібліятэцы ёсць.